**Дадатак 3**

Наш праект называецца ***“Мая Радзіма Беларусь”.*** Сама назва і тэма ўрока падказалі нам ідэю прадставіць яго ў выглядзе бліц-турніру ***“А ці ведаеце вы?”*** ; пытанні будуць па геаграфіі, гісторыі і краязнаўстве.

***Крыху тэорыі.*** Вам даўно вядома, што адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінакі (назвы вуліц, завулкаў, плошчаў, зямель, ваяводстваў і г.д.) пішуцца **з малой літары**. **З вялікай літары** пішуцца ўсе словы, якія абазначаюць індывідуальныя назвы дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Да іх адносяцца аднаслоўныя найменні *(Магілёўская вобласць),* састаўныя найменні, якія пішуцца ў два-тры словы *(Рэспубліка Беларусь, Мар’іна Горка);* а таксама ўсе неафіцыйныя назвы тэрыторый, мясцовасцей, утвораныя прыставачна-суфіксальным або суфіксальным спосабам: *Панямонне, Прыдняпроўе, Магілёўшчына.*

Геаграфічныя і астранамічныя назвы таксама пішуцца з вялікай літары, за выключэннем слоў з родавым значэннем – агульных назоўнікаў (рака, возера, зорка, мыс і г.д.): *рака Сож, Дняпроўска-Бугскі канал.*

---

А зараз мы просім вас адказаць на пытанні бліц-турніру “А ці ведаеце вы?” і запоўніць карткі з адказамі. Запісваем родавую і відавую назвы, каб замацаваць правапіс малой і вялікай літар.

1. Якое возера ў Беларусі самае глыбокае? (возера Доўгае) Дзе яно знаходзіцца? (у Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці).
2. Якая рака ў Беларусі самая вялікая? (рака Дняпро)
3. Ужо больш за 600 год гэтай запаведнай зоне. Назавіце гэты запаведнік, уключаны ў спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. (Белавежская пушча)
4. Назавіце абласны горад, які знаходзіцца на рацэ Нёман. (горад Гродна)
5. Назавіце назву населенага пункта Беларусі, у склад якога ўваходзіць слова "Красны", як сінонім слова "Прыгожы". Бальшавікі ж зрабілі просты пераклад Красны=Чырвоны, так і паўстала назва ______________________ (Чырвоны Бераг).